Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 266 (335)
АЎТОРАК 19 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ З КАНДЫДАТАМІ ПАРТЫІ

Вялікія і адказныя задачы стаяць перад партыйнымі арганізацыямі ў справе выхавання кандыдатаў партыі. Гаворачы аб гэтых задачах, В. І. Ленін указваў на неабходнасць «вызначыць з асоба дэтальнымі падрабязнасцямі, у чым павінна адбыцца сапраўднае праходжанне кандыдацкага стажу, якія павінны быць канкрэтныя і практычныя ўмовы праверкі таго, што кандыдацкі стаж сапраўды праходзіцца, а не застаецца пустой фармальнасцю».

Не пустой фармальнасцю, а сапраўднай школай большэвіцкага выхавання павінен быць кандыдацкі стаж! На гэта не раз указваў і таварыш Сталін. Аб значэнні кандыдацкага стажу яскрава запісана ў статуце ВКП(б). «Новыя члены,—гаворыцца ў статуце, — прымаюцца з ліку кандыдатаў, прайшоўшых кандыдацкі стаж. У члены партыі прымаюцца свядомыя, актыўныя і адданыя справе комунізма рабочыя, сяляне і інтэлігенты».

Следуючы ўказанням Леніна і Сталіна, няўхільна выконваючы патрабаванні статута ВКП(б), пярвічныя, раённыя і гарадскія партыйныя арганізацыі павінны працаваць з кандыдатамі сістэматычна і сур'ёзна, павінны выхоўваць з кандыдатаў свядомых, актыўных, беззаветна адданых справе комунізма большэвікоў.

Як-жа ажыццяўляюцца гэтыя задачы ў нашай вобласці?

Да пастановы ЦК ВКП(б) ад 10 ліпеня 1940 года «Аб устараненні недахопаў у справе прыёму членаў ВКП(б)» работа з кандыдатамі ў большасці *пярвічных арганізацый* была пастаўлена выключна дрэнна. Як правіла, работа з кандыдатамі абмяжоўвалася толькі нарадамі. Сістэматычная партыйная вучоба кандыдатаў не праводзілася. Многія кандыдаты не ўцягваліся ў практычную партыйную работу.

Толькі таму ў дні работы абласной партканферэнцыі было 273 кандыдаты з пратэрмінаваным стажам. Толькі таму рад кандыдатаў не падрыхтаваліся да ўступлення ў члены ВКП(б), а асобныя з іх сталі нарушальнікамі як партыйнай, так і працоўнай дысцыпліны. Кандыдат партыі чыгуначнай міліцыі станцыі Беласток Тарасаў з дня ў дзень п'янстваваў. Яму далі вымову. Але і гэта не дапамагло, п'янкі працягваліся. Падобна Тарасаву вёў сябе кандыдат партыі гродзенскай партарганізацыі Антонаў. І Тарасаў, і Антонаў, вядома, з кандыдатаў партыі выключаны.

Пасля пастановы ЦК ВКП(б) ад 10 ліпеня, пасля яе абмеркавання на партыйных сходах, работа з кандыдатамі ў нашай вобласці прыкметна палепшылася.

Кандыдаты партыі, як правіла, з'яўляюцца перадавымі рабочымі і служачымі. Рэдка можна знайсці такую арганізацыю, дзе кандыдаты не маюць партыйных даручэнняў. Наладжваецца глыбокая партыйная вучоба кандыдатаў партыі.

Як станоўчы прыклад, можна назваць партыйную арганізацыю беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 6. Тут усе кандыдаты праводзяць вялікую грамадска-палітычную работу. Кандыдат партыі тав. Гімпельсон кіруе гуртком па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», у якім займаецца 22 чалавекі. Кандыдат партыі тав. Арсеньеў з'яўляецца агітатарам, кіруе фізкультурным калектывам і арганізоўвае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» сярод камсамольцаў і несаюзнай моладзі. Загадчык разліковага стала кандыдат партыі тав. Быкоўская таксама працуе агітатарам і кіруе сацыяльна-бытавым сектарам фабкома.

— Нашы кандыдаты партыі, — расказвае сакратар партарганізацыі 6-га камбіната тав. Рубінштэйн,— своечасова і добрасумленна выконваюць усе даручэнні партыйнай арганізацыі. Зараз яны праводзяць вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных: робяць даклады, праводзяць гутаркі, растлумачваюць сталінскі выбарчы закон. Вось чаму іх і іншых комуністаў рабочыя паважаюць як перадавых людзей прадпрыемства.

У Замбраве павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню займаюцца ўсе кандыдаты. Кандыдат партыі тав. Грыгор'еў ужо вывучыў 10 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Нядрэнна наладжваецца работа з кандыдатамі ў Замбраве, Граеве, Саколках і іншых раёнах.

Аб паляпшэнні работы з кандыдатамі гавораць і даныя росту радоў членаў ВКП(б). Беластоцкая абласная партыйная арганізацыя за перыяд пасля канферэнцыі прыняла ў члены ВКП(б) 267 кандыдатаў партыі.

Але ў некаторых партарганізацыях ёсць яшчэ нямала недахопаў. *Выхаванне кандыдатаў партыі* ў асобных партыйных арганізацыях яшчэ не ўзнята на належную вышыню.

У Беластоку пратэрмінаван стаж у 89 кандыдатаў, у Гродне — у 39 кандыдатаў. Усяго па вобласці налічваецца 258 кандыдатаў з пратэрмінаваным стажам. Прычым 14 чалавек у кандыдатах партыі састаяць з 1931 года, 28 чалавек— з 1932 года, 22 чалавекі — з 1933—1937 гадоў. Значыць, недастаткова пастаўлена работа с кандыдатамі партыі. Дрэнна, напрыклад, пастаўлена работа з кандыдатамі партыі ў арганізацыі чыгуначнай міліцыі станцыі Гродна, у арганізацыі ўпраўлення Беластоцкай чыгункі, на 18 тэкстыльным камбінаце, у некаторых арганізацыях Монькаўскага, Ваўкавыскага і іншых раёнаў.

Задача партыйных арганізацый нашай вобласці заключаецца ў тым, каб хутчэй і поўнасцю ліквідаваць усе недахопы ў рабоце з кандыдатамі ВКП(б). Трэба перш за ўсё наладзіць партыйную вучобу кандыдатаў, практычна аказваць дапамогу таварышам, якія самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», ахапіць гурткамі тых, якія не падрыхтаваны да самастойнай работы над сабой. Кандыдаты партыі, як і члены, абавязаны паказваць найлепшыя прыклады ў рабоце, на якім-бы ўчастку яны ні знаходзіліся.

Сістэматычна і лепш працаваць з кандыдатамі партыі! Больш і лепш працаваць над тым, каб кандыдацкі стаж з'яўляўся сапраўднай школай большэвіцкага выхавання!

ДАДЗІМ КРАІНЕ ДАДАТКОВЫЯ СОТНІ ТЫСЯЧ МЕТРАЎ ТКАНІН

НА СХОДЗЕ СТАХАНАЎЦАЎ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАСТОКА.

Памяшканне клуба шарсцянікаў запоўнілі перадавыя людзі тэкстыльнай прамысловасці. Тут інжынерна-тэхнічныя работнікі, камандзіры вытворчасці, кіраўнікі фабрык, стаханаўцы прадпрыемстваў. Прысутнічаюць госці — прадстаўнікі ўкраінскіх тэкстыльшчыкаў. У рабоце схода прынялі ўдзел Нарком тэкстыльнай прамысловасці БССР тав. Аляксееў, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Марыя Дзьячук і іншыя.

Кіраўнік беластоцкага тэкстыльнага трэста тав. Карташоў падрабязна спыніўся на рабоце, праробленай беластоцкімі тэкстыльшчыкамі за 10 месяцаў.

— Прайшоўшы перыяд,—указвае тав. Карташоў,—быў скарыстаны для правядзення вялікай работы па рэканструкцыі прадпрыемстваў, канцэнтрацыі, абсталявання і ўстанаўлення правільнага тэхналагічнага працэса. Гэта работа ідзе і зараз.

За 10 месяцаў работы нязмерна вырас стаханаўскі рух на тэкстыльных прадпрыемствах. Шырыцца армія многастаночнікаў. Настойлівая, крапатлівая работа рабочых тэкстыльнай прамысловасці дала магчымасць перавыканаць дзесяцімесячную праграму. Так, па пражы план за 10 месяцаў выканан на 112 процантаў, па сураўю—на 106 процантаў і па гатоваму тавару—на 104.

Аднак гэтыя лічбы не могуць засланіць недахопаў, якія маюць месца ў рабоце беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці. Не гледзячы на выкананне плана па трэсту ў цэлым, рад прадпрыемстваў не выконваюць сваіх заданняў. Узяць, напрыклад, камбінат № 4. Гэтае прадпрыемства першыя два кварталы было перадавым і нават з'яўлялася кандыдатам на атрыманне пераходнага сцяга. Але на гэтым кіраўнікі камбіната супакоіліся, і план трэцяга квартала быў сарван. У кастрычніку план выканан усяго на 62,8 процанта.

Уязвімым месцам прадаўжае аставацца якасць выпускаемай прадукцыі. З месяца ў месяц не выконваецца план па сортнасці тавараў. Замест 86 процантаў па плану прадпрыемствы тэкстыльнага трэста ў кастрычніку выпусцілі 79 процантаў першасортнай прадукцыі. Гэта тлумачыцца галоўным чынам недастатковай барацьбой за строгае захаванне тэхналагічнага рэжыму.

Перад беластоцкімі тэкстыльшчыкамі ў чацвертым квартале стаяць вялікія і адказныя задачы. Улічваючы рэзервы беластоцкіх прадпрыемстваў, урад павялічыў план па выпуску тканін, давёўшы гадавы план да 12 мільёнаў 614 тысяч метраў.

Выступленні па дакладу тав. Карташова насілі канкрэтны і дзелавіты характар. Выступаўшыя гаварылі аб недахопах, якія тармозяць паспяховае выкананне плана, аб прастоях у рабоце.

На трыбуне чатырохстаночнік 1-га тэкстыльнага камбіната тав. Бахрах. Тав. Бахрах спыняецца на рабоце стаханаўцаў 1-га камбіната. Ён указвае, што спачатку многія рабочыя не рашаліся пераходзіць на ўшчыльненую работу, а калі ўпэўніліся ў перавагах гэтага метада, сталі пераходзіць на многастаночнае абслугоўванне. Толькі за першую палову кастрычніка 90 рабочых перайшлі на многастаночнае абслугоўванне.

Брыгадзір комсамольска-маладзёжнай брыгады Майсей Бэз у сваім выступленні спыніўся на рабоце стаханаўцаў 5-га тэкстыльнага камбіната. Ён, у прыватнасці, расказаў аб вопыце работы сваёй брыгады.

Начальнік змены 29-й фабрыкі тав. Гільман расказаў удзельнікам схода аб поспехах рабочых фабрыкі, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у сваёй рабоце, датэрмінова выканаўшы гадавы план. Усе ткачы фабрыкі асвоілі норму выпрацоўкі.

Змястоўным было выступленне стаханаўца-двухстаночніка 2-га камбіната тав. Вільчэўскага. Тав. Вільчэўскі падкрэсліў значэнне соцыялістычных метадаў працы, якія далі магчымасць калектыву камбіната датэрмінова выканаць гадавую вытворчую праграму.

Прысутнічаўшая на сходзе матальшчыца Кіеўскай тэкстыльнай фабрыкі тав. Семенчук у сваім выступленні перадала прывітанне беластоцкім тэкстыльшчыкам і выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва стаханаўку 2-га камбіната тав. Фурман. Начальнік ткацкага цэха 3-га камбіната тав. Саракавяк прыняў выклік начальніка цэха крэменчугскай фабрыкі тав. Розенмана.

На сходзе выступіў нарком тэкстыльнай прамысловасці БССР тав. Аляксееў, які зачытаў загад наркома тэкстыльнай прамысловасці СССР тав. Акімава аб узнагароджанні перадавых людзей тэкстыльнай прамысловасці Беластока. Згодна загада, 2-му тэкстыльнаму камбінату ўручан пераходны чырвоны сцяг Наркомтэкстыля СССР і ЦК саюза шарсцянікаў. Асоба адзначыўшыхся ў выкананні і перавыкананні планаў нарком узнагародзіў значком «Выдатніку соцыялістычнага спаборніцтва Наркомтэкстыля». Узнагароджаны: С. В. Іваноў, М. В. Юшкевіч, І. М. Зайцаў, Г. Ф. Дынерман, В. М. Кавалеўская, І. С. Хрэноўскі, І. І. Дзікоўскі, М. Я. Левіна, П. І. Керэз, І. Н. Мельнікаў, А. І. Магілеўскі, В. О. Берда, А. Ю. Багдановіч, В. Л. Пісарэвіч, Г. Н. Савіцкі, Б. А. Медлінскі, Ф. М. Барташук, Ф. А. Завадскі, А. П. Скаўронская, Н. М. Гершковіч, В. І. Рожка і О. Я. Каплан.

На сходзе была зачытана пастанова журы аб прысуджэнні пераходнага Чырвонага сцяга тэкстыльнага трэста і абкома саюза шарсцянікаў фабрыкі № 29, якая заваявала першынства ў соцыялістычным спаборніцтве беластоцкіх прадпрыемстваў.

Удзельнікі схода прынялі тэкст звароту да ўсіх тэкстыльшчыкаў Беластоцкай вобласці. У гэтым звароце сход заклікаў шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае выкананне гадавой праграмы, дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных сустрэць новымі вытворчымі перамогамі.

І. Апельбаум.



На здымку: Прысучальшчыцы тт. Муклевіч Я. А. (злева) і Сідарава А. Ю., якія выконваюць норму на сельфактары на 112 процантаў.

Фота А. Сапіра.

Да ўсіх лесарубаў і возчыкаў Совецкай Беларусі

Пісьмо стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса.

Хутка споўніцца год, як мы працуем на лесазагатоўках у Стаўбцоўскім леспрамгасе. Многа перамен адбылося ў нашым жыцці за прайшоўшы перыяд. Мы пазналі радасць соцыялістычнай працы; праца стала для нас справай чэсці, доблесці і геройства. Мы адчуваем сябе свабоднымі. У краіне соцыялізма людзей цэняць па іх працы, па іх творчых здольнасцях, накіраваных на ўмацаванне нашай соцыялістычнай радзімы. Мы ведаем, што кожны загатоўлены намі кубаметр драўніны пойдзе на патрэбы соцыялістычнага будаўніцтва, і ўсе нашы імкненні, уся наша энергія накіраваны на тое, каб лепш і больш прадукцыйна працаваць, каб даць краіне тысячы кубаметраў высокаякаснай драўніны звыш устаноўленага плана.

Добра аўладаўшы стаханаўскімі метадамі работы, працуючы брыгадай, мы сапраўды адчулі вялікую перавагу гэтага метада ў параўнанні з ранейшым, калі мы працавалі ў адзіночку, або на пару. У мінулым годзе ў пачатку зімы ў нашым леспрамгасе было ўсяго тры брыгады лесарубаў, а зараз іх 27. Гэтая колькасць падвоіцца—у гэтым мы ўпэўнены. Толькі ў брыгадзе можна дасягнуць высокай прадукцыйнасці працы. За апошнія 8 месяцаў наша брыгада атрымала адных прэмій-надбавак 8.109 руб., выпрацаваўшы 1.264 нормы. На працягу ўсяго года не было амаль ні аднаго дня, каб наша брыгада давала менш 230 проц. дзённага задання. У кастрычніку месячны план выканан на 270 проц. Заработак кожнага члена брыгады складае 900—1.000 рублёў у месяц.

Дасягнуўшы зімой мінулага года рэкорднай выпрацоўкі, мы на гэтым не спыніліся. Трэба было замацаваць першыя поспехі і сістэматычна, планамерна, з дня ў дзень павышаць тэмпы. Гэтага мы дабіліся. Але стаханаўцы ніколі не спыняюцца на дасягнутым, яны ўвесь час шукаюць новых шляхоў для няўхільнага руху ўперад. Таму мы імкнемся ўсяляк павышаць сваю прадукцыйнасць.

Магчымасцей для гэтага вельмі многа ў кожным леспрамгасе, у кожнай брыгадзе, трэба толькі працаваць чэсна і самааддана. Мы-ж працуем не на капіталістаў, не на памешчыкаў, а на сябе, для свайго народа, для сваёй соцыялістычнай краіны. Мы працуем над тым, каб наша радзіма стала яшчэ больш багатай, яшчэ больш магутнай.

Нашай краіне патрэбен лес. Яго чакаюць вугальшчыкі Данбаса, гарнякі Крывароржжа, яго чакаюць лесапільныя, дрэваапрацоўчыя, хімічныя, запалкавыя прадпрыемствы, соцыялістычныя будоўлі. Гэты лес мы павінны даць, і мы яго дадзім.

Абмеркаваўшы на вытворчай нарадзе брыгады гэтае пытанне, мы рашылі, што наш план на IV квартал у 3.000 кубаметраў мы можам выканаць датэрмінова да 15 снежня. Мы ўпэўнены, што гэта могуць зрабіць і астатнія брыгады.

Таварышы лесарубы і возчыкі! Арганізуем соцыялістычнае спаборніцтва па прыкладу вугальшчыкаў, металістаў, нафтавікоў нашай краіны за лепшую, высокаякасную работу, за датэрміновае выкананне месячнага і квартальнага плана, за павышэнне прадукцыйнасці працы, за прымяненне дасканалых стаханаўскіх метадаў работы. Давайце працаваць так, як гэтага патрабуе і вучыць нас вялікі правадыр народаў Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

У заходніх абласцях нашай рэспублікі набліжаецца дзень выбараў у мясцовыя Советы. Гэту вялікую дату мы павінны сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Брыгада абавязваецца к 15 снежня — дню выбараў загатовіць звыш плана 2.000 кубаметраў высокаякаснай драўніны і заклікае да гэтага ўсіх лесарубаў і возчыкаў.

Таварышы лесарубы і возчыкі рэспублікі! Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, шырэй стаханаўскі рух! Дадзім нашай краіне лесаматэрыялы ў дастатковай колькасці.

Владзімір Міцкевіч,
Аляксандр Міцкевіч,
Міхаіл Залівака,
Аляксандр Стома—
стаханаўская брыгада лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных

РЭГІНА КАПЛАН (Зося Львоўна Цытрын)

Акруговая выбарчая камісія Скідэльскай выбарчай акругі № 86 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Рэгіну Каплан (Зосю Львоўну Цытрын), 1908 года нараджэння, старшыню абласнога камітэта МОПР'а.

АЛЯКСЕЙ МІХАЙЛАВІЧ МІСНІКЕВІЧ

Акруговая выбарчая камісія Тваратоўскай выбарчай акругі № 89, Цэхановецкага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Аляксея Міхайлавіча Міснікевіча, 1898 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Цэхановецкага райвыканкома.

ЯНІНА ІВАНАЎНА САДОЎСКАЯ

Акруговая выбарчая камісія Дамброўскай выбарчай акругі № 91, Чыжаўскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Яніну Іванаўну Садоўскую, 1919 года нараджэння, беспартыйную, фінансавага агента Вяліка-Дамброўскага сельсовета, Чыжаўскага раёна.

СЯМЁН КАНДРАЦЬЕВІЧ ТАЛКАЧОЎ

Акруговая выбарчая камісія Чыжаўскай выбарчай акругі № 92 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Сямёна Кандрацьевіча Талкачова, 1905 года нараджэння, члена ВКП(б), сакратара Чыжаўскага райкома КП(б)Б.

ПАВЕЛ ГЕОРГІЕВІЧ КАНАВАЛАЎ

Акруговая выбарчая камісія Зарэмбаўскай выбарчай акругі № 93, Чыжаўскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Паўла Георгіевіча Канавалава, 1904 года нараджэння, члена ВКП(б).

ВЕРА ІОСІФАЎНА БУЙНОЎСКАЯ

Акруговая выбарчая камісія Старасельскай выбарчай акругі № 23, Беластоцкага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Веру Іосіфаўну Буйноўскую, 1920 года нараджэння, матальшчыцу, 8-га Васількоўскага тэкстыльнага камбіната.

ФРАНЦ ВІКЕНЦЬЕВІЧ МАЛІНОЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Карыцынскай выбарчай акругі № 26, Бранскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Франца Вікенцьевіча Маліноўскага, 1897 года нараджэння, беспартыйнага, служачага.

АЛЯКСЕЙ ФЯДОСЬЕВІЧ КУЛІКАЎ

Акруговая выбарчая камісія Пякуцкай выбарчай акругі № 28, Бранскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Аляксея Фядосьевіча Кулікава, 1903 года нараджэння, члена ВКП(б), загадчыка аблфінаддзелам.

МАРЫЯ ІВАНАЎНА ДЗЬЯЧУК

Акруговая выбарчая камісія Бельскай выбарчай акругі № 29, Бельскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Марыю Іванаўну Дзьячук, 1902 года нараджэння, беспартыйную, намесніка загадчыка абласнога аддзела соцыяльнага забеспячэння, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР.

ГЕРАСІМ ІВАНАВІЧ РУСАК

Акруговая выбарчая камісія Гацькаўскай выбарчай акругі № 30, Бельскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Герасіма Іванавіча Русака, 1890 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Бельскага райвыканкома.

АНТАНІНА ІВАНАЎНА ФЕДАРЧУК

Акруговая выбарчая камісія Боцькаўскай выбарчай акругі № 31, Бельскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных Антаніну Іванаўну Федарчук, 1922 года нараджэння, члена ЛКСМБ, калгасніцу калгаса імені Сталіна, Пілікоўскага сельсовета.

У апошнюю гадзіну.

Бамбардыроўка Гамбурга

БЕРЛІН, 18 лістапада. (ТАСС). Германская газета «Гамбургер фрэмдэнблат» перадае, што ў час налёту 15 і 16 лістапада на Гамбург англійскія самалёты скінулі вялікую колькасць запальваючых і фугасных бомб. У выніку бамбардыроўкі пацярпелі жылыя кварталы. У некаторых частках горада ўзніклі пажары. Сярод грамадзянскага насельніцтва налічваецца некалькі забітых і многа раненых.

Газета падкрэслівае, што гэта быў самы вялікі налёт на Гамбург з пачатку вайны.

Да прабывання Чыано і Серана Суньера ў Германіі

БЕРЛІН, 18 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро з Берхтэсгадэна, італьянскі міністр замежных спраў Чыано і іспанскі міністр замежных спраў Серана Суньер наведалі сёння германскага міністра замежных спраў Рыбентропа ў яго маёнтку паблізу Зальцбурга. Праз некаторы час Серана Суньер наведаў Гітлера ў яго рэзідэнцыі паблізу Берхтэсгадэна. Гітлер меў гутарку з Серана Суньерам, у час якой прысутнічаў таксама Рыбентроп.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Снядаўскай выбарчай акругі № 74! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Марыю Людвігаўну ФЛЁР'ЯН!

★ ★ ★

Марыя Людвігаўна Флёр'ян

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Быў 1926 год. Маладая настаўніца Марыя Людвігаўна Флёр'ян прыехала на работу ў глухую вёску Крысякі. Тут была аднакамплектная пачатковая школа, якую наведвала 80 дзяцей сялян. Маркотна і сумна праходзілі першыя дні маладой настаўніцы. Яна была адзіным прадстаўніком інтэлігенцыі ў вёсцы. Сялянскія дзяўчаты чамусьці трымаліся воддаль і, відаць, лічылі недасягальнай дружбу з «паннай научыцелькай».

Нямала цяжкасцей прышлося сустрэць і ў самой педагагічнай практыцы. Не хапала вопыту, не было з кім параіцца, а займацца трэба было адной з чатырма класамі. Да таго-ж многія вучні часта прапускалі ўрокі: то абуць няма чаго, то працаваць трэба на гаспадарцы, дапамагаючы бацькам.

Але маладая настаўніца не пала духам. Выхадзец з бядняцкай сялянскай сям'і (бацька меў два гектары зямлі), яна добра разумела, як патрэбна асвета працоўным. Вось чаму з усёй энергіяй, з юнацкім запалам аддалася яна любімай справе. Яна падружыла з сялянамі — бацькамі сваіх вучняў, а ў дзяцей заваявала любоў і пашану.

У 1928 годзе Марыю Людвігаўну перавялі ў прадмесце горада Остравенькі — Бялабель. Тут, у паўшэхнай школе, навучаліся дзеці рабочай і сялянскай беднаты. Марыя Людвігаўна арганізуе дапамогу бяднейшым вучням. Яна наведвае сваіх вучняў на даму, цікавіцца іх бытам, іх жыццём. З сям'і селяніна Сакоўскага ў школу хадзіла тры вучні. Іх бацька жыў настолькі бедна, што далейшая вучоба дзяцей была немагчымай. І Марыя Людвігаўна з уласнай пенсіі штомесячна аказвае сям'і грашовую дапамогу.

Маладая настаўніца добра памятала, як цяжка было ёй, дачцы селяніна-бедняка, здабыць сярэднюю асвету. Скончыўшы ў 1920 годзе пачатковую школу, ёй ледзь удалося паступіць у Тарноўскую настаўніцкую семінарыю. Для таго, каб пракарміць сябе і ўнесці плату за навучанне, Марыя вымушана была зарабляць прыватнымі ўрокамі. Будучы настаўніцай, яна прыкладае ўсе свае сілы, каб зрабіць даступнай навуку дзецям працоўных.

З 1931 года па сучасны момант Марыя Людвігаўна Флёр'ян працуе настаўніцай у вёсцы Каменова (цяпер Клечкоўскі сельсовет, Снядаўскага раёна).

Радасна сустрэла тав. Флёр'ян прыход геройчнай Чырвонай Арміі—

вызваліцельніцы. З яшчэ большай энергіяй працуе яна ў совецкай школе на карысць народнай асветы.

— Прызнацца, — гаворыць тав. Флёр'ян, — я думала, што з устанаўленнем совецкай улады ў нас будуць толькі рускія і беларускія школы. Аказваецца, я памылялася. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка дае магчымасць усім дзецям працоўных вучыцца на роднай мове. У нашай мясцовасці — большасць польскага насельніцтва і ў нас працуе школа на польскай мове. Дзеці былі вельмі задаволены і рады, калі ў пачатку бягучага вучэбнага года прыбылі совецкія падручнікі на польскай мове. Наша школа зараз усім забяспечана, мы штодзённа адчуваем клопаты нашай партыі і совецкай улады аб школе.

Марыя Людвігаўна — вопытны педагог, які любіць сваю прафесію ад усёй душы. Яна любіць дзяцей, і дзеці любяць і паважаюць сваю настаўніцу. Гэта любоў, адданасць сваёй рабоце забяспечваюць поспех. Марыя Людвігаўна дабілася таго, што вучні другога і чацвертага класаў, у якіх яна працуе, ніколі не прапускаюць урокаў і вельмі старанна вучацца. У мінулым вучэбным годзе ўсе 12 выпускнікоў чацвертага класа паспяхова вытрымалі іспыты і зараз навучаюцца ў пятым класе Снядаўскай НСШ. Марыя Людвігаўна спадзяецца, што і ў гэтым годзе ў яе класе не будзе ні аднаго другагодніка.

З ахвотай вывучаюць дзеці рускую мову. Не гледзячы на тое, што гэты прадмет толькі ў гэтым годзе стаў выкладацца, а сама настаўніца вывучыла рускую мову таксама толькі сёлета на курсах, вынікі атрымліваюцца выдатныя.

Марыя Людвігаўна — паважаны сярод сялян чалавек. Яна актыўна працуе сярод бацькоў як агітатар, удзельнічае ў грамадскім жыцці. У вёсцы Александрова тав. Флёр'ян арганізавала гурток, з якім сістэматычна займаецца два разы ў тыдзень. Гурток наведвае 21 выбаршчык, і яшчэ не здаралася такога выпадку, каб хто з слухачоў прапусціў заняткі. Усе з ахвотай слухаюць гутаркі Марыі Людвігаўны. На занятках гуртка вывучаецца Палажэнне аб выбарах, Канстытуцыя БССР, чытаюцца газеты.

Тав. Флёр'ян павышае свой ідэйны і педагагічны ўзровень, яна вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», прымае актыўны ўдзел у рабоце метадычнай секцыі, вывучае совецкую педагогіку, авалодвае совецкімі метадамі абучэння і выхавання.

Сяляне вёскі Александрова на перадвыбарчым сходзе аднадушна вылучылі свайго агітатара, настаўніцу Марыю Людвігаўну Флёр'ян кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

На сустрэчы з выбаршчыкамі, на якой прысутнічала 200 чалавек, Марыя Людвігаўна заявіла:

— Калі вы акажаце мне давер'е, выбраўшы дэпутатам у органы совецкай улады, я буду выконваць свой пачотны і адказны абавязак таксама чэсна, як я выконваю абавязак настаўніцы на ўсім працягу сваёй педагагічнай работы.

Можна верыць тав. Флёр'ян!

Т. Лясовіч.

Выбаршчыкі Заблудаўскай выбарчай акругі № 56! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Івана Давыдавіча СКАЎРОНСКАГА!

★ ★ ★

Іван Давыдавіч Скаўронскі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Ёсць людзі, жыццё якіх не ўпрыгожана важнымі падзеямі, не багата яркімі фарбамі і штрыхамі. Да такіх людзей адносіцца Іван Скаўронскі — рабочы Заблудаўскага скурзавода. Тым не менш, калі трэба было выбраць кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, 280 рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў скурзавода на сваім сходзе аднадушна назвалі імя гэтага скромнага і простага чалавека. І не памыліліся.

Іван Скаўронскі, перш за ўсё чалавек крыштальнай чэснасці, які ўсё сваё жыццё правёў у беднасці і галечы. Сын нястачы і няўзгод, стоптаны і аплёваны ненавіснай панскай Польшчай, стаў чалавекам і грамадзянінам толькі тады, калі заззяла яркімі праменнямі сонца з усхода над змучанай зямлёй Заходняй Беларусі. Новы совецкі грамадзянін Іван Скаўронскі паказаў сябе здольным арганізатарам, энергічным работнікам і разумным агітатарам, з душой акунуўшымся ў грандыёзную творчую работу па будаўніцтву новага, справядлівага жыцця, без памешчыкаў і капіталістаў.

* * *

У 1905 годзе ў селяніна Давыда Скаўронскага, з вёскі Зваркі, што размешчана пад Заблудавам, нарадзіўся сын Іван. У сям'і гэта было сапраўдным няшчасцем. Дзяцей было поўная хата, а зямлі не прыбавілася: як было, так і асталося паўтара гектары. Бацька батрачыў, батрачылі і дзеці. Ледзь падрос Іван — і ён не быў ужо лішнім ротам у хаце. Пасвіў свіней, працаваў на шасе, у лесе. Маленькі Іван з сіл выбіваўся, каб быць толькі дастойным памочнікам свайго бацькі.

1914 год. Імперыялістычная вайна сее голад і разруху, стварае вялікую армію бежанцаў. Сярод іх сям'я Скаўронскага. Уся сям'я жыве ў Самары і ледзь перабіваецца выпадковымі заработкамі.

З перамогай Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Іван стаў вучнем 13-й совецкай школы г. Самары і паспяхова заканчвае школу першай ступені.

Сям'я Скаўронскіх едзе дамоў у сваю родную вёску Зваркі з надзеяй, што цяпер можна будзе зажыць новым жыццём. Але гэта толькі марай асталося. Польская шляхта тут бесцарамонна глумілася над працоўным людам. Сям'я



пазбавілася свайго галоўнага кармільца—бацькі. Яшчэ горш стала, чым пры царызме. Іван рвецца зноў у Совецкі Саюз у знаёмую Самару. Маці клапоціцца перад вышэйшым начальствам, каб сыну дазволілі выехаць у Совецкі Саюз. Калі Іван прышоў да беластоцкага старасты і расказаў яму, той гаркнуў на яго:

— Якім ты камісарам хочаш стаць, а свіней хто пасці будзе?!..

Такі быў лёс гэтай няшчаснай сям'і, якая павінна была астацца жыць пад панскім ботам. Сям'я разышлася. Кожны стаў сабе шукаць лепшага жыцця. Іван рашыў стаць шаўцом. Вучыўся і мучыўся у гаспадароў, ледзь перабіваючыся, дабыў сабе прафесію. У Заблудаве ўсе ведалі «Ванькушаўца». Ён слыў добрым майстрам, абуваў сотні людзей, а сам ледзь канцы з канцамі зводзіў.

Рабочыя Заблудава шчыра палюбілі яго за чэсную натуру, за праўдзівае слова, за яго прамату. За гэта яго не любілі багацеі.

Самым вялікім шчасцем для сябе лічыў Іван Скаўронскі — гэта хоць мысленна перанасіцца ў Совецкі Саюз. Хоць пагражала вялікая небяспека, ён тайком з перадавымі рабочымі слухаў часта родную Маскву па радыё, ад душы радаваўся і гардзіўся за совецкую краіну.

Гістарычную прамову тав. Молатава 17 верасня ён таксама слухаў па радыё. І сумесна з мільёнамі пакрыўджаных і прыгнечаных ён апладыраваў у чэсць вызваленчага паходу геройчных палкоў слаўнай Чырвонай Арміі.

Шавец Іван Скаўронскі становіцца сакратаром Часовага ўпраўлення Заблудава. На гэтай адказнай рабоце ён бліснуў сваімі здольнасцямі арганізатара.

Удзень і ўноч, не ведаючы сну, ён наладжвае нармальнае жыццё ў Заблудаве, нарушанае вайной. Гэта была яго першая ступень дзяржаўнай работы. У час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ён быў нястомным агітатарам за яго сапраўдную радзіму — СССР.

Іван Скаўронскі па заслугах ацэнен. Яго пасылаюць на вучобу ў Гродна. Там ён вучыцца на курсах па падрыхтоўцы нарміроўшчыкаў для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Паспяхова скончыўшы вучобу, ён накіроўваецца на Заблудаўскі скурзавод у якасці загадчыка аддзелам тэхнічнага кантролю.

Такі звычайны шлях простага рабочага шаўца. Рабочыя скурзавода ведаюць яго не толькі па вытворчай рабоце, але і як актыўнага грамадскага работніка. Ён рэдагуе заводскую насценгазету «Чырвоны гарбар», вядзе агітацыйную работу ў цэху.

Калектыў рабочых і служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў Заблудаўскага скурзавода № 3 вылучыў Івана Давыдавіча Скаўронскага кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета працоўных па Заблудаўскай выбарчай акрузе № 56.

Нястомнай работай на дабро свайго народа ён апраўдае давер'е сваіх выбаршчыкаў.

Г. Голэнд.

Выбаршчыкі Шумоўскай выбарчай акругі № 75! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Цімафея Грыгор'евіча МАРОЗАВА!

★ ★ ★

Цімафей Грыгор'евіч Марозаў

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

— Што пра сябе расказваць?— гаворыць тав. Марозаў. — Звычайнае ў мяне жыццё, нічога геройчнага, ніякіх асаблівых заслуг няма. Куды пашле партыя, там і працую.

У гэтых скупых словах — сутнасць Цімафея Грыгор'евіча Марозава — сына большэвіцкай партыі Леніна—Сталіна, скромнага, шчырага і адданага. Яго жыццёвы шлях ад грузчыка да адказнага партыйнага работніка з'яўляецца тыповым у краіне соцыялізма.

Цімафей Грыгор'евіч Марозаў нарадзіўся ў 1909 годзе ў мястэчку Копысь, на Беларусі. У дзяцінстве вучыцца прышлося мала — скончыў толькі чатырохкласную пачатковую школу. І гэта зразумела, бо яго бацька —селянін -бядняк меў усяго два з паловай гектары зямлі, а сям'я складалася з 9 чалавек. У 15-гадовым узросце Цімафей ідзе грузчыкам на станцыю. А праз год уступае ў комсамол і комсамольскай арганізацыяй камандыруецца ў Аршанскую прафесіянальную тэхнічную школу дрэваапрацоўшчыкаў.

Скончыўшы ў 1928 годзе профтэхшколу і атрымаўшы спецыяльнасць сталяра, Цімафей Марозаў да 1930 года працуе на лесазаводах. Ён актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, з'яўляецца членам фабкома і членам акруговага ўпраўлення саюза дрэваапрацоўшчыкаў. На Стайкаўскім лесазаводзе Цімафей Марозаў уступае ў 1929 годзе кандыдатам у члены партыі Леніна—Сталіна.

У 1930 годзе калектыў рабочых Стайкаўскага лесазавода выдучае тав. Марозава на кіруючую профсаюзную работу. Ён працуе упаўнаважаным акруговага профсовета і інспектарам працы ў Горках. У адказны перыяд калектывізацыі тав. Марозава пасылаюць на самы цяжкі ўчастак — у райкалгассаюз. І тут ён паказвае сябе добрым арганізатарам , стойкім большэвіком.

З 1931 года тав. Марозаў працуе на розных адказных пасадах: старшым інспектарам працы, старшынёй Ленінскага сельсовета, старшынёй

Горацкага горвыканкома, а ў перыяд уручэння калгасам актаў на вечнае карыстанне зямлёй — загадчыкам райземаддзела.

У 1937 годзе на раённым партыйным сходзе тав. Марозаў выбіраецца другім сакратаром Горацкага райкома партыі. Дзе ні працаваў у далейшым Цімафей Грыгор'евіч Марозаў—старшынёй Чавускага райвыканкома, загадчыкам ваеннага аддзела Магілеўскага абкома партыі — усюды ён праяўляў сябе, як здольны работнік, скромны і чэсны, непрымірымы да ворагаў соцыялізма.

У студзені 1940 года рашэннем ЦК КП(б)Б тав. Марозаў камандыруецца ў Беластоцкую вобласць дапамагаць вызваленаму народу будаваць шчаслівае і радаснае жыццё. Цімафей Грыгор'евіч Марозаў працуе зараз першым сакратаром Снядаўскага райкома партыі.

Снядаўскі раён знаходзіцца ля самай дзяржаўнай граніцы. Прыгранічнасць высоўвае новыя задачы, звязаныя з умацаваннем абароннай магутнасці нашай радзімы. І раён нядрэнна спраўляецца з гэтай задачай.

Вялікая работа праробленна партыйнай арганізацыяй па прывядзенню сяла Снядава ў культурны раённы цэнтр. Раней тут не было ні клуба, ні кіно, ні амбулаторыі. Цяпер тут пабудаван выдатны раённы дом соцыялістычнай культуры, кінотэатр, пабудавана часовая электрастанцыя, якая ўжо асвятліла частку мястэчка. Адкрыта раённая бальніца і пабудавана раённая амбулаторыя. Запрошаны на пастаянную работу кваліфікаваныя ўрачэбныя сілы, якіх раней зусім не было ў Снядаве. Працоўныя раёна атрымалі бясплатную медыцынскую дапамогу. У раённым цэнтры пабудавалі першую лазню, пажарную, 10 двухкватэрных дамоў, заканчваецца будаўніцтва новай школы.

У Снядаўскім раёне створана МТС, арганізавана тры калгасы. Калгаснікі атрымаюць у гэтым годзе ў сярэднім па 6—8 кілограмаў зернавых, 10—12 кілограмаў бульбы і паўтара рублі грашыма на працадзень.

Снядаўскі раён паспяхова выканаў усе абавязкі перад дзяржавай (хлебапастаўкі, бульбапастаўкі і т. д.).

Зараз у раёне разгорнута перадвыбарчая агітацыя сярод працоўных. 412 агітатараў, галоўным чынам з мясцовага насельніцтва, нясуць большэвіцкае слова ў масы.

Калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны пагранічнік», рабочыя спіртазавода, сяляне вёскі Срэдна і мястэчка Шумова аднадушна вылучылі Цімафея Грыгор'евіча Марозава кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Верны сын партыі Леніна—Сталіна, тав. Марозаў з'яўляецца дастойным кандыдатам.

Ал. Нёманскі.

Выбаршчыкі Багуцкай выбарчай акругі № 90! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Іосіфа Іванавіча КУХТА!

★ ★ ★

Іосіф Іванавіч Кухта

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Вестка аб тым, што часці Чырвонай Арміі перайшлі совецка-польскую граніцу, хутка дайшла і да салдат былой польскай арміі, стаяўшых у Заходняй Украіне. Але яны, не гледзячы на жорсткі націск афіцэраў, не збіраліся ўступаць у бой. Наадварот, салдаты з нецярпеннем чакалі прыходу чырвоных воінаў, бо ведалі, што гэта іх кроўныя браты і што ідуць яны для таго, каб вызваліць працоўных ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Салдат Іосіф Іванавіч Кухта ў тыя дні думаў толькі аб адным: хутчэй-бы сустрэцца з чырвонаармейцамі!

— А далей,—гаварыў ён, — усё будзе зроблена так, як трэба. Установім совецкую ўладу, прагонім з нашай зямлі дармаедаў і крывапіўцаў—капіталістаў і памешчыкаў.

Перад вачыма Іосіфа ўжо тады раскрывалася карціна будучага. Ён ведаў, што ў Совецкім Саюзе існуе Сталінская Канстытуцыя, што ў СССР усе працоўныя маюць права на працу, на адпачынак, на асвету.

Чырвоныя войскі набліжаліся. Вось пачалі ўжо гаварыць, што яны знаходзяцца ў 7-мі кілометрах. Сярод афіцэраў—замяшанне. Большасць з іх кінулася на ўцёкі. Салдаты-ж накіраваліся ў другі бок— на ўсход, насустрач чырвоным.

І калі чырвоныя танкісты знаходзіліся ў поўкілометры ад іх, Іосіф Іванавіч у ліку першых не ішоў, а бег насустрач вызваліцелям. Бег і ў адзін голас з іншымі салдатамі ўсклікаў:

— Няхай жывуць Советы! Няхай жыве Чырвоная Армія!..

Месяц прабыў разам з чырвонымі байцамі тав. Кухта. За гэты час ён даведаўся аб тым, аб чым нават і не думаў.

— Вось гэта краіна! Вось гэта наша сапраўдная радзіма!—гаварыў Іосіф Іванавіч.—Мы будзем змагацца за тое, каб і наш адсталы, аграблены памешчыкамі і капіталістамі край стаў такім-жа багатым і цудоўным.

З такой думкай, з такім жаданнем ён прышоў у вёску Нур, Цэханавецкага раёна, дзе настаўнічаў у 1932 годзе.

Спачатку ў вёсцы Нур, а потым у вёсцы Жэбры Нурскага сельсовета тав. І. І. Кухта ўзяўся за работу ў школе. Яго назначылі дырэктарам няпоўнай сярэдняй школы і выкладчыкам польскай мовы. У Жэбрах хутка пабудавалі новую школу. Вучыцца пачалі ўсе дзеці школьнага ўзросту. У панскай-жа Польшчы больш 100 дзяцей гэтай вёскі не мела магчымасці займацца ў школе.

Жыццё стала вясёлым і радасным. Тав. Кухта на вёсцы лічыцца першым актывістам. У дні выбараў у Народнае Сабранне ён быў агітатарам, у дні выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР — старшынёй участковай выбарчай камісіі. Зараз тав. Кухта вылучан і зарэгістрыраван кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета па Багуцкай выбарчай акрузе № 90.

— Я марыў аб школе, аб пастаяннай рабоце... А тут—на табе! Мяне, былога беднага селяніна, простага сельскага настаўніка, не толькі забяспечылі работай, а нават вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета!—заяўляе тав. Кухта.— Прыму ўсе меры, каб апраўдаць гэта высокае давер'е.

Такім стаў радавы салдат былой польскай арміі. Такім стаў сын беднага селяніна-паляка з вёскі Пагажэль, Мінск-Мазавецкага раёна, Варшаўскага павета. Яго бацька, які меў 4 гектары зямлі, усе свае сродкі аддаваў на вучэнне сына, але-ж далей радавога настаўніка пачатковай школы Іосіф не пайшоў. А зараз Іосіф Кухта стаў дырэктарам школы, будзе дзяржаўным дзеячом.

Тав. Кухта дабіўся добрых паказчыкаў у рабоце школы. Першая чвэрць бягучага навучальнага года закончана пры паспяховасці вучняў у 95 процантаў. 35 процантаў вучняў—выдатнікі. Няма адстаючых у вывучэнні польскай і рускай моў.

Адначасова тав. Кухта арганізаваў у вёсцы школу дарослых. У ёй займаецца 87 чалавек. У групе па ліквідацыі непісьменнасці займаецца 14 сялян і сялянак.

Іосіф Іванавіч яшчэ зусім малады. Ён нарадзіўся ў 1907 годзе. Але-ж за свае 33 годы ён многае бачыў, многае перажыў. Не адзін год быў беспрацоўным.

Маючы званне настаўніка, ён працаваў простым рабочым на заводзе.

Навекі скончыліся пакуты Іосіфа Іванавіча Кухты! Стаўшы на шлях соцыялізма, малады настаўнік тав. Кухта клянецца верна служыць працоўнаму народу. І для яго няма і не можа быць нічога лепшага, нічога больш пачотнага, як служыць свайму народу.

В. Стальноў.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета

Чырвоны куток 32-й ваціннаватнай фабрыкі ледзь змяшчае сабраўшыхся. Усе ажыўлена гутараць. Старшыня фабкома Зіна Чэснер адкрывае сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета.

Пасля выбараў прэзідыума слова просіць тав. Верцю. Ён прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных слесара тав. Кавальскага. Кавальскаму 29 год. Ён выхадзец з сям'і рабочага, усю сваю маладосць аддаў справе рабочага класа.

— Работа механічнага цэха, — гаворыць тав. Кравецкі, — пайшла зусім па-іншаму, як у цэх прышоў тав. Кавальскі. Ён актыўны мопра-вец, прайшоў суровую школу ў польскіх турмах. Яго асудзілі да 10 год турэмнага зняволення за ўдзел у забойстве правакатара.

Тав. Свентахоўская прапануе вылучыць кандыдатуру тав. Пырко. Каму з беластоцкіх тэкстыльшчыкаў не вядомы Пырко (Вацэк), які неаднаразова ўзначальваў барацьбу рабочых супроць капіталізма. Год назад тав. Пырко быў выбран дэпутатам у Народнае Сабранне.

— Мы ўпэўнены, што тав. Пырко, як дэпутат гарадскога Совета, будзе аддана працаваць на дабро працоўных, — гаворыць тав. Топаль.

Зіна Чэснер прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета намесніка дырэктара фабрыкі, тав. Рубіновіча. Лазара Рубіновіча добра ведаюць беластоцкія рабочыя. У пачатку — комсамолец, а потым — член комуністычнай партыі, ён усё сваё свядомае жыццё аддае барацьбе супроць капіталізма, барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю.

Яго, сакратара чырвонага прафсаюза харчавікоў, бесперапынна праследвала польская паліцыя. У 1928 годзе ён быў асуджан на 12 год турэмнага зняволення.

Сход аднадушна падтрымаў вылучаных кандыдатаў.

Вылучаны давераныя: па 148 выбарчай акрузе тав. Віца, па 131 выбарчай акрузе тав. Кліменкова і па 205 выбарчай акрузе тав. Чэснер.

Н. Перэльштэйн.

Перадвыбарчы сход на 29-й фабрыцы

Рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі 29-й фабрыкі сабраліся 12 лістапада на агульны сход, каб вылучыць кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета. Пасля выбрання прэзідыума пачалося абмеркаванне кандыдатур.

Вылучаюцца людзі, жыццё якіх прысвечана барацьбе за справу працоўнага народа.

Тав. Каменман яшчэ зусім малой дзяўчынкай дапамагае рабочым у барацьбе з капіталістамі. Яна ўступае ў нелегальную піонерскую арганізацыю. Потым арышт і некалькі год турэмнага зняволення ў жаночай турме Фардон. Цяпер тав. Каменман працуе на фабрыцы ў якасці старшай мотальшчыцы. Яна адна з лепшых грамадскіх работніц і актыўная комсамолка.

Працяглымі апладысментамі сход аднагалосна вылучае яе кандыдатуру ў дэпутаты гарадскога Совета.

Таксама аднагалосна вылучана кандыдатура тав. Кононава — дырэктара фабрыкі, старога бальшэвіка, актыўнага ўдзельніка грамадзянскай вайны.

Кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета вылучан тав. Дружынін — начальнік гарадской міліцыі, тав. Вільчэўская — мотальшчыца, член фабкома і прафорг апаратнага цэха, тав. Кшывінскі — стары кадравік.

С. Розеншайн.

Семінар старшынь і сакратароў участковых выбарчых камісій гор. Беластока

14 і 15 лістапада ў беластоцкім Доме партыйнай асветы адбываўся агульнагарадскі семінар старшынь і сакратароў участковых выбарчых камісій. Старшыня гарадской выбарчай камісіі тав. Кучэўскі і старшыня горвыканкома тав. Ражноўскі падрабязна растлумачылі прысутным Палажэнне аб выбарах, расказалі, як трэба арганізаваць работу на ўчастках, каб выдатна падрыхтавацца і правесці выбары.

На ўчастках устаноўлены дзяжурствы членаў выбарчых камісій. Паўсямесна правяраюцца спіскі выбаршчыкаў, арганізуюцца сталы даведак і т. д. Але-ж многія ўчастковыя камісіі яшчэ не разгарнулі падрыхтоўчай работы да дня выбараў. Горш за ўсё тое, што да работы на ўчастках прыступілі не ўсе члены камісій. Марудна праходзіць афармленне ўчасткаў. Многія члены камісій яшчэ не ведаюць сваіх абавязкаў, не знаёмы з Палажэннем аб выбарах.

У заключэнне семінара з прамовай выступіў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Раманаў.

Шчучын мяняе свой выгляд

На абодвух баках маленькай рэчкі Вісы раскінуўся невялікі горад Шчучын. Гэта быў звычайны захалусны і брудны гандлярскі гарадок, які славіўся сваім манастыром. Тут не было электрастанцыі, лазні, бальніцы, аптэкі.

Толькі з прыходам Чырвонай Арміі Шчучын зажыў новым жыццём. Старшыня горсовета Павел Яндоўскі з радасцю расказвае аб горадзе:

— У дамы жыхароў праведзена электрычнасць, пабудаваны лазня, клуб, бібліятэка, у памяшканні былога манастыра — школа. Абсталявана раённая бальніца, адкрыты магазіны і т. д. Дзесяткі дамоў адноўлены і адрамантаваны.

Увечары ў бібліятэцы заўсёды людна. Сюды прыходзяць працоўныя за кнігамі, пачытаць газеты, журналы. 200 чытачоў мае шчучынская бібліятэка. Рэгулярна працуе вячэрняя школа для дарослых.

Мяняецца горад, мяняюцца і людзі. У Шчучыне налічваецца больш 60 чалавек новай совецкай інтэлігенцыі. Зараз, у час выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы, працоўныя Шчучына радасна адзначаюць свае поспехі за год совецкай улады. Яны ведаюць, што ўперадзе яшчэ больш радаснае жыццё.

В. Гарбачёў.

Самыя старыя выбаршчыкі горада Беластока правяраюць свае прозвішчы ў выбарчых спісках.

На здымку (злева направа): агітатар тав. Пшэвульская Ю. А. дае тлумачэнні Шыдлоўскай М. Ю. (66 гадоў), Анісеевай Е. Ю. (76 гадоў) і Рэпніцкаму Л. О. (86 гадоў). Фота А. Саліра.

Будні агітатараў

Вечарэе. У чырвоным кутку вёскі Багушэва вялікае ажыўленне. Тут сабралося многа сялян і сялянак. Прыходзяць усё новыя і новыя асобы. Займаючы месцы за доўгім сталом, яны пытаюць: «Ну, што нам раскажа сёння Антон Сцяпанавіч?» Яны прышлі паслухаць яго цікавую і захапляючую гутарку.

Агітатар Антон Сцяпанавіч Валенціновіч зарэкамендаваў сябе сярод жыхароў вёскі як талковы дакладчык, бяседчык, чытчык.

Сёння яны прышлі на чарговыя заняткі. Тэмай заняткаў Антон Сцяпанавіч намеціў вывучэнне Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, а таксама чытку газет аб бягучых падзеях. У памяці слухачоў тав. Валенціновіч пакідае глыбокія сляды. Яго словы зразумелы і даходзяць да свядомасці выбаршчыкаў.

Дзейнасць агітатара тав. Валенціновіча шырокая і разнастайная. Яму па душы гэта адказная работа. На занятках ён кожны раз вышуквае новыя факты, новыя прыклады, умее добра выкарыстаць цытаты з кніг і журналаў, супаставіць дасягненні краіны соцыялізма з лічбамі капіталістычных краін, шырока карыстаецца мясцовымі матэрыяламі.

У папярэднюю выбарчую кампанію асабліва выдзеліўся агітатар станцыі Граева Сяргей Нікалаевіч Магілка. Рабочыя і служачыя аб ім адклікаюцца як аб выдатным таварышу і ўмелым агітатару. Як толькі быў апублікаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у мясцовыя Советы і аб'яўлена аб пачатку выбарчай кампаніі, тав. Магілка зараз-жа прыступіў да агітацыйнай работы сярод рабочых будаўнікоў. На першых-жа занятках ён зачытаў сабраўшымся Указ. Тут-жа ён параіўся з прысутнымі і намеціў дні заняткаў.

Вывучаючы Сталінскую Канстытуцыю, Сяргей Нікалаевіч падрабязна спыняецца на дасягненнях краіны соцыялізма і на тых змяненнях, якія адбыліся ў жыцці вызваленага народа. Вывучаючы артыкул Канстытуцыі аб правах грамадзян на медыцынскую дапамогу, ён расказаў аб росце сеткі медыцынскіх устаноў у раёне, прыводзіў канкрэтныя прыклады. Да прыходу Чырвонай Арміі ў раёне была толькі адна бальніца і некалькі прыватных урачоў і фельчараў. Зараз у раённым цэнтры адкрыта бальніца, амбулаторыя, зубаўрачэбны кабінет, туберкулёзны пункт, станцыя хуткай дапамогі, дзіцячая кансультацыя, венералагічны і вочны пункты. У сельскіх советах ёсць дзве бальніцы і 25 медыцынскіх пунктаў. У гэтых установах працуе 15 урачоў і некалькі дзесяткаў сярэдняга медыцынскага персанала. На ахову здароўя ў раёне ў гэтым годзе адпушчана больш 3 мільёнаў рублёў. А ў апошні год гаспадарнічання польскіх паноў у былым Шчучынскім павеце па гадавому каштарысу на ахову здароўя было адпушчана толькі 17 тысяч рублёў.

Усе гэтыя факты з мясцовага жыцця даходлівы слухачам.

Вось агітатар Клаўдзія Цімафееўна Пузанава. Яна вядзе заняткі вячэрняй школы для дарослых. Гаворачы аб новым жыцці вызваленага народа, Клаўдзія Цімафееўна не забывае і аб мясцовых фактах. Акрамя прыкладаў расшырэння школьнай сеткі, яна расказвае аб клопатах партыі і ўрада па выхаванню дзяцей. 81 сям'я ў раёне атрымала дапамогу ад дзяржавы па многадзетнасці.

Сярод працоўных раёна шырока вядома імя агітатара Івана Грыгор'евіча Старыковіча. Перад аудыторыяй рабочых, сялян і інтэлігенцыі ён часта выступае з дакладамі і лекцыямі. Зараз Іван Грыгор'евіч актыўна ўключыўся ў выбарчую кампанію. Ён з'яўляецца агітатарам. Яго яркія і змястоўныя даклады і лекцыі маюць вялікі поспех. Умова поспеху — старанная падрыхтоўка да правядзення заняткаў і вялікая работа над сабой. Нядаўна тав. Старыковіч закончыў вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Ён чытае мастацкую літаратуру, газеты і журналы.

Такія будні лепшых агітатараў Граеўскага раёна. Яны ўмела нясуць палкія словы бальшэвіцкай праўды ў масы выбаршчыкаў.

В. Г.

Яшчэ больш клапаціцца аб здароўі працоўных

Цяжкія ўмовы жыцця працоўных, пагардлівыя адносіны ўлад да аховы здароўя стварылі ў былой панскай Польшчы глебу для соцыяльных эпідэмічных захворванняў. Не праходзіла года, каб эпідэмія не наведвала горад, а асабліва вёскі, уносячы ў магілу многія жыцці.

Адзін буржуазны вучоны пісаў: «Дзяржава не павінна дапамагаць хворым, гэта не яе справа, хворы прадстаўляе інтарэс толькі для сваіх родных, доктара і аптэкара. Калі ў дзяржавы ёсць лішнія грошы, — іх варта траціць на тое, каб сільным, здаровым, смелым жылося лепш». Гэтым прынцыпам і кіраваліся ў панскай Польшчы. Таму няма нічога дзіўнага, што ў панскай Польшчы расла смяротнасць, падала нараджаемасць, пагаршаўся фізічны стан насельніцтва. Калі ў 1930 годзе на тысячу насельніцтва прыходзілася 17 нараджэнняў, то ў 1935 годзе лік нараджэнняў падае да 12,1.

З часу ўстанаўлення совецкай улады ў заходніх абласцях БССР хутка расце і развіваецца ахова здароўя працоўных. Бюджэт выдаткаў на ахову здароўя па нашай вобласці ў 1940 годзе складае 28 мільёнаў руб. Адсюль рэзкае расшырэнне лячэбнай сеткі. За 14 месяцаў совецкай улады колькасць больніц павялічылася на 123 проценты, лік ложкаў у іх на 150 процантаў, лік амбулаторый на 200 процантаў, жаночых і дзіцячых кансультацый на 400 процантаў і т. д. Створаны новыя лячэбныя установы, якіх зусім не было раней (санітарныя станцыі, фельчарскія і фельчарска-акушэрскія пункты, санітарная авіяцыя і інш.). 31 урач з раённых цэнтраў і гарадоў выязджаюць на пастаянную работу ў вёску. Створаны радзільныя дамы, малочныя кухні, рэнтгенаўскія кабінеты, для працоўных сталі даступны санаторыі, піонерскія лагеры, курорты. У выпадках тэрміновай кансультацыі ці неадкладнага хірургічнага ўмяшання ў раёны вылятаюць на самалётах кваліфіцыраваныя спецыялісты.

Але побач з дасягненнямі мы маем яшчэ рад істотных недахопаў. У практыцы некаторых лячэбных устаноў да гэтага часу наглядаюцца факты нячулых, фармальных адносін да хворых. У Ваўкавыску рожаніца памерла з-за халатных адносін да работы дзяжурнай акушэркі. Адзін цяжка хворы, прывезены на грузавой машыне, каля гадзіны чакаў прыёму ўрача 2-й бальніцы Крывадубскага. Цяжка хворую брушным тыфам не прынялі ў Ломжынскую бальніцу. Груба абыходзіліся з хворым Любічам у 3-яй бальніцы і т. д.

Ёсць факты і дрэннай якасці лячэбнай работы (недакладная дыягностыка, разыходжанне ў пастаноўцы дыягназу ля пасцелі хворага і на секцыйным стале, недакладнае афармленне медыцынскіх дакументаў).

Не ва ўсіх лячэбных установах чыста і культурна. Наглядаюцца факты антысанітарыі.

Не наладжана яшчэ медыцынскае абслугоўванне дзяцей у Беластоку. Грошы, адпушчаныя на разгортванне сеткі лячэбных і прафілактычных устаноў для дзяцей у некаторых раёнах (Бельск, Ваўкавыск, Граева) да гэтага часу не выкарыстаны па прызначэнню.

Слаба разгорнута яшчэ санітарна-прафілактычная работа як у горадзе, так і на вёсцы.

Некаторыя лячэбныя ўстановы дрэнна падрыхтаваліся да зімы, не ўсюды атрамантаваны будынкі, не хапае дроў і т. д.

Органам аховы здароўя прыдзецца яшчэ многае зрабіць для таго, каб медыцынскае і санітарна-прафілактычнае абслугоўванне працоўных наладзіць па-большэвіцку.

С. Рапапорт,
намеснік загадчыка аблздраўаддзела.

Пра стыль работы аднаго заўкома

У пакоі душна і цесна. Над галовамі кружыцца воблака табачнага дыму. Здзіўляцца, вядома, нечаму. Плошча пакоя, прыкладна, 25 метраў, а наведвальнікаў — каля 60 чалавек: сюды сабраліся рабочыя, члены профсаюза на сход.

Усё абсталяванне пакоя складалася з двух паламаных лавак і аднаго стала. Акрамя таго, у адным вугле стаяла драўляная скрынка, а пасярод пакоя — бар'ер-перагародка ў метр вышынёй. Такім чынам, прыстасоўваліся, як хто мог: хто на бар'еры, хто на падлозе, а хто на скрынцы. Каму не дасталося месца сесці, прышлося стаяць.

Пачаўся сход. Старшыня заўкома тав. Ясенеўскі, не лічачы патрэбным выбіраць прэзідыум, аб'яўляе павестку дня і прадастаўляе слова дырэктару завода тав. Табарыскаму.

Дырэктар гаварыў ціха, доўга. Пасля даклада было зададзена толькі адно пытанне. Выступленняў не было. Рашэнняў ніякіх не прымалася. На гэтым сход закрыўся.

За апошнія месяцы такіх сходаў і нарад на кафельным заводзе № 16 праведзена больш чым сто, а вынікі і каштоўнасць іх даведзены да нуля.

Састаў профсаюзнага камітэта на заводзе нядрэнны. Яго старшыня тав. Ясенеўскі актыўны рабочы. У саставе заўкома лепшыя рабочыя-стаханаўцы. Але бяда ў тым, што няма належнага кіраўніцтва над камітэтам: ніхто яго не азнаёміць дастаткова хаця-б з самымі простымі задачамі профсаюзнай работы. Інструктар ЦК саюза па Беластоцкай вобласці тав. Керамікоў замест крапатлівай работы толькі гастраліруе па заводах і займаецца «кіраўніцтвам увогуле». Заводскія камітэты прадастаўлены самім сабе. Толькі таму і не кіруе заўком усім грамадскім і вытворчым жыццём завода.

Клуб на заводзе без догляду: там брудна і няўтульна. Грамадскія арганізацыі, як МОПР, Асоавіяхім і іншыя, не працуюць. Соцыялістычным спаборніцтвам, тэхнічнай вучобай рабочых заўком не кіруе, культурна-бытавымі пытаннямі рабочых не займаецца. На заводзе каля 30 рабочых — малапісьменныя ці зусім непісьменныя. Але-ж заўком не прымае ніякіх мер для таго, каб ліквідаваць непісьменнасць.

На заводзе выраслі дзесяткі актыўных адданых рабочых-стаханаўцаў, якія паказваюць прыклады соцыялістычных адносін да працы, але многія з іх яшчэ стаяць у баку ад грамадска-палітычнага жыцця.

На жаль, такія недахопы маюць месца і на іншых заводах трэста будаўнічых матэрыялаў.

Так працягвацца больш не павінна.

Заўком павінен стаць цэнтрам і кіраўніком творчага ўздыму, профсаюзнага, грамадскага, культурнага і палітычнага жыцця працоўных мас. Гэта будзе надзейнай асновай у барацьбе за выкананне дзяржаўных планаў, за якасць прадукцыі, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны.

Д. Пецярэнка.

ГЕРАІЧНЫЯ СТАРОНКІ МІНУЛАГА

ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ ПА НАШАЙ ОБЛАСЦІ

Становішча рабочых і сялян ў панскай Польшчы з кожным годам усё больш пагаршалася. Асабліва ў цяжкім становішчы знаходзіліся народы Заходняй Беларусі. Галеча, цемра, бескультурнасць, непісьменнасць былі пастаяннымі спадарожнікамі ў сям'і рабочага, у хаце беларускага насельніцтва.

Урад памешчыкаў і капіталістаў люта здзекваўся над рабочымі і сялянамі, асабліва беларусамі. Гвалтоўна праводзілася асіміляцыя беларускага народа. Польскаму ўраду ў гэтым актыўна дапамагалі існаваўшыя на тэрыторыі Польшчы буржуазныя і дробнабуржуазныя партыі, як ППС, Бунд, ОЗОН і іншыя. У праграме партыі ОЗОН мы чытаем:

«Адносіны беларускага насельніцтва да польскай дзяржавы нездавальняючыя», а таму «нашай мэтай з'яўляецца асіміляцыя беларускага насельніцтва», неабходна «навязаць яму другую мову» і «рашуча змагацца супроць ператварэння беларускай мовы ў літаратурную». (Беластоцкі абласны архіў).

Аднак народы Заходняй Беларусі, а таксама рабочыя і сяляне палякі, яўрэі і іншыя нацыянальнасці не спынялі барацьбы супроць ненавісных польскіх капіталістаў і памешчыкаў. Ні тэрор, ні здрадніцтва «правадыроў» ППС, Бунда і іншых лакеяў буржуазіі не маглі спыніць выступленняў рабочага класа і сялянства. Аб гэтым сведчаць многалікія факты. Пачынаючы з 1919 года і да 1939 года адбылося многа гераічных стачак і забастовак рабочых, якія былі падаўлены сілай польскай дэфензівы з дапамогай ППС, Бунда.

Прывядзем некаторыя факты. У 1926 годзе, у знак салідарнасці з англійскімі вугляконамі, пачалася забастоўка рабочых на тэкстыльных прадпрыемствах Беластока. У чэрвені 1927 года ў забастоўцы тэкстыльных рабочых прымала ўдзел звыш 5 тысяч чалавек. Забастоўка ахапіла не толькі горад, але і раёны. Арганізаваныя стачачныя камітэты вялі паспяховую барацьбу супроць фабрыкантаў. Забаставалі таксама рабочыя лесапільных заводаў Беластока, Гродна і Брэста. Забастоўка скончылася-б поспехам, калі-б яе не сарвалі здраднікі з ППС і Бунда, якія пайшлі на змову з фабрыкантамі.

Зімой 1931 года на глебе голаду, беспрацоўя хваля рэвалюцыйных выступленняў рабочых і сялян распаўсюдзілася па ўсёй Заходняй Беларусі. Сяляне Ваўкавыскага раёна адмовіліся плаціць падаткі, не вышлі на дарожныя павіннасці. Да іх далучыліся сяляне суседніх валасцей. Паўстаўшыя беларускія сяляне спальвалі памешчыцкія сядзібы, разбівалі паліцэйскія ўчасткі, высякалі лясы. У гэты-ж час забаставалі беластоцкія тэкстыльшчыкі, рабочыя лесапільных заводаў Гродна, рабочыя Ломжы і Васількова.

Для падаўлення сялянскіх выступленняў у беларускія сяленні Пілсудскім былі накіраваны карныя экспедыцыі, якія жорстка распраўляліся з сялянамі-паўстанцамі, спальвалі іх дамы.

Комуністычная партыя Заходняй Беларусі, звяртаючыся да сялян, тады заклікала «даць баявы адпор карным экспедыцыям, выступаць у палітычных забастоўках, змагацца за зямлю без выкупу, за далучэнне Заходняй Беларусі да Беларускай ССР». (Беластоцкі абласны архіў).

У 1932 годзе забастоўкі праходзяць на плюшавай фабрыцы Бекера, на лесапільных заводах Беластока і Гродна. Яны накіраваны супроць паніжэння зарплаты, супроць звальнення рабочых з фабрык і заводаў, за выдачу дапамогі беспрацоўным.

Аб салідарнасці рабочых і сялян у барацьбе за агульную справу сведчыць наступны факт. Сяляне ў дапамогу баставаўшым рабочым Супраслі прыслалі ў снежні 1932 года 95 пудоў бульбы, 110 кілаграмаў хлеба, 70 кілаграмаў мукі, 60 кілаграмаў гароху. Рабочыя Беластока прыслалі 100 кілаграмаў хлеба, грошы і іншае. У забастоўцы ў Супраслі прымала ўдзел больш 500 чалавек. Адбылася крывапралітная сутычка з карнымі атрадамі, якая скончылася перамогай баставаўшых.

12—14-гадзінны рабочы дзень, голад, нізкая заработная плата, прымусілі рабочых да забастоўкі, якая ахапіла ўсё Беластоцкае лясніцтва ў канцы 1934 года. У ёй удзельнічала звыш 2 тысяч рабочых лясной прамысловасці. Гэта забастоўка была накіравана супроць так званага закона «аб шкодніцтве ў лясах і на полі». Згодна гэтага закона, сялянам забаранялася збіраць у лесе ягады, грыбы. За парушэнне закона саджалі ў турму.

Наступленне на рабочых і сялян з боку капіталістаў і памешчыкаў яшчэ больш узмацняецца ў сувязі з прыняццем 23 красавіка 1935 года новай канстытуцыі ўзамен існаваўшай з 1921 года. Новая канстытуцыя ліквідавала ўсе дэмакратычныя правы. Па гэтай канстытуцыі выбранымі ў сенат і сейм маглі быць тыя, якія займалі афіцэрскія пасады, мелі вышэйшую асвету, а таксама прадстаўнікі буйных прамысловых саюзаў. Аб выбарах у мясцовыя самаўпраўленні (магістраты, гміны) у канстытуцыі зусім не ўпаміналася, яны вызначаліся асобым палажэннем.

Артыкул 2-гі канстытуцыі гласіў: «На чале дзяржавы стаіць прэзідэнт рэспублікі», які за сваю дзейнасць не нясе ніякай адказнасці перад народам і не дае справаздачы яму. У пункце другім прама гаворыцца аб тым, што «на ім ляжыць адказнасць толькі перад богам і гісторыяй за лёс дзяржавы», у «яго асобе сканцэнтравана поўная і непадзельная ўлада».

Рабочы клас і працоўнае сялянства не маглі мірыцца з гэтай рэакцыйнай канстытуцыяй. У канцы 1935 года выбары ў сейм па новай канстытуцыі былі байкатыраваны рабочымі. Не гледзячы на тое, што да выбарчых урн рабочых і сялян-беларусаў часта прыводзілі паліцэйскія, выбары пацярпелі поўнае паражэнне.

Пасля правалу выбараў у сейм урад Касцялкоўскага замяняецца ўрадам генерал Славой-Складкоўскага, якога заслужана рабочыя называлі «Трэпавым». Ён арганізуе яўрэйскія пагромы, карныя атрады, якія разграмілі дзесяткі беларускіх вёсак, спалілі сотні дамоў.

У 1936—1938 гг. хваля стачак, забастовак, сялянскіх выступленняў пашырылася. Гэтыя стачкі і выступленні былі пратэстам супроць рэакцыйнага ўрада, які стаў на шлях прамога тэрору, грабяжу і разгрому рабочага класа і сялянства.

Рабочыя і сяляне давалі жорсткі адпор буржуазіі, змагаліся за свае правы.

Ф. Александраў.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Падрабязнасці германскага налёту на Кавентры

БЕРЛІН, 17 лістапада. (ТАСС). Учора ўсе берлінскія газеты змясцілі пад буйнымі загалоўкамі паведамленне аб паветраным нападзе германскай авіяцыі на буйны цэнтр англійскай прамысловасці — Кавентры. Газета «Фелькішэр беобахтэр» змяшчае паведамленне аб бамбардыроўцы Кавентры пад загалоўкам «На Кавентры скінута звыш 500 тысяч кілаграмаў бомб».

Ваенны карэспандэнт, які прымаў удзел у гэтым налёце, піша: «Масаваму налёту германскай авіяцыі садзейнічала выдатнае надвор'е. Поўная луна ясна асвятляла аб'екты. Пажары, узнікшыя ў Кавентры, былі настолькі моцнымі, што іх можна было бачыць за 200 кіламетраў, і лётчыкі фактычна арыентаваліся пры сваім палёце на гэтае святло, не карыстаючыся навігацыйнымі прыборамі. Велізарныя пажары дакладна ўказвалі курс. На шляху да Кавентры англійская зенітная артылерыя адкрыла загараджальны агонь. Англійскія пражэктарныя часці стараліся аказаць пасільную дапамогу сваёй артылерыі. Пры набліжэнні да горада, — піша карэспандэнт, — можна было бачыць суцэльнае мора агню».

ЛОНДАН, 17 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт «Дэйлі экспрэс», які наведаў Кавентры, паведамляе, што ў рэзультаце бамбардыроўкі горад зусім разбураны. Галоўныя вуліцы Кавентры і ў тым ліку лепшыя грамадскія будынкі, кінотэатры, магазіны ператвораны ў груду руін. У многіх месцах немагчыма вызначыць, дзе праходзіла дарога і дзе былі размешчаны дамы і магазіны. Сотні дамоў разбураны і ў прыгарадах Кавентры. Многія тысячы жыхароў асталіся без прытулку.

Дзіўна тое, — працягвае карэспандэнт, — што многія даўня і жывапісныя будынкі часоў Шэкспіра ўсталі супроць бомб, у той час як будынкі сучаснага тыпу разбураны. Адзначаны прамыя пападанні бомб у рад сховішчаў. Як мяркуюць, у сховішчах прыгарадаў выратаваліся тысячы жыхароў. Карэспандэнт адзначае самаадданую работу медыцынскага персанала шпіталя, хірургічны корпус якога быў разбураны. Урачы і абслугоўваючы персанал беспярэрывна працягвалі сваю работу як у ноч на 15 лістапада, калі меў месца налёт на горад, так і на працягу 15 і 16 лістапада. Вялікая колькасць забітых і раненых налічваецца сярод асабістага састава пажарных каманд. Усякія перасоўванні ў раёне горада ў цяперашні час забаронены. Карэспандэнт указвае, што ў ноч на 16 лістапада аўтамабілі не змаглі дасягнуць ні аднаго раёна, размешчанага паблізу цэнтра горада, у якім пылалі велізарныя пажары. Дзейнасць пажарных каманд была моцна затруднена недахопам вады з прычыны пашкоджанняў водаправодных магістралей. Таму ў некаторых выпадках прышлося ўзрываць будынкі дынамітам, каб перашкодзіць распаўсюджванню агню.

Карэспандэнт піша, што харчовыя склады Кавентры сур'ёзна не пацярпелі, у сувязі з чым у горадзе ў цяперашні час не адчуваецца вострага недахопу ў харчаванні. Натрабы насельніцтва абслугоўваюць перасовачныя магазіны, некаторыя з якіх функцыянавалі нават у час бамбардыроўкі Кавентры. Карэспандэнт указвае, што разам з горадам ад атакі 15 лістапада жыхары горада накіроўваліся ў навакольныя сельскія раёны ў пошуках жыллішчаў. Аўтобусы былі перапоўнены. Сотні бяздомных людзей былі добраахвотна прыняты навакольнымі жыхарамі. Карэспандэнт газеты «Дэйлі мейль», які таксама наведаў Кавентры, адзначае, што асаблівы клапатлівыя адносіны да бяздомнага насельніцтва Кавентры былі праяўлены ў навакольных рабочых раёнах.

Міністэрства інфармацыі перадае, што у Кавентры наведаў кароль. Яго суправаджалі міністр унутраных спраў і унутранай бяспекі Марысон і парламенцкі сакратар міністэрства аховы здароўя Хорсбру. Кароль прабыў у Кавентры звыш 4-х гадзін.

Становішча ў Кавентры

НЬЮ-ЙОРК, 18 лістапада. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, які знаходзіцца ў Кавентры (Англія), перадае, што да гэтага часу працягваюць узрывацца германскія бомбы павольнага дзеяння. У горадзе ўсё яшчэ няма газу, электрычнасці і вады. Паўсюды бачны затухаючыя пажары. Перасовачныя пункты харчавання снабжаюць харчамі жыхароў горада, якія засталіся без прытулку.

КАВЕНТРЫ

(Даведка)

Горад Кавентры, які падвергся ў ноч на 15 лістапада ўзмоцненай бамбардыроўцы з боку германскай авіяцыі, размешчаны у Цэнтральнай Англіі, у 151 кілометры на паўночны захад ад Лондана. Кавентры знаходзіцца ў графстве Уорык, якое з'яўляецца разам з трыма другімі графствамі адным з буйнейшых і старэйшых машынабудаўнічых і металаапрацоўчых раёнаў Англіі, вядомых пад назвай «Чорная краіна». Цэнтрам гэтага раёна з'яўляецца Бірмінгам, трэці па велічыні горад Англіі, на паўднёвы ўсход ад якога знаходзіцца Кавентры.

Кавентры — адзін з важнейшых цэнтраў па вытворчасці аўтамабіляў, самалётаў і авіяматораў. Акрамя гэтага ў горадзе ёсць прадпрыемствы шарсцяной і хімічнай прамысловасці, а таксама прадпрыемствы па вытворчасці штучнага шоўку і электраапаратуры. У час сусветнай вайны 1914—1918 г. г. прадпрыемствы Кавентры былі адным з галоўных чыннікаў вытворчасці боепрыпасаў і рознага роду ваенных матэрыялаў.

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 18 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі перадае наступную зводку: «У ноч на 17 і ўдзень 17 лістапада германская авіяцыя паспяхова бамбардыравала Лондан і аб'екты ваеннага значэння ў Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Каля ўсходняга ўзбярэжжа Англіі патоплен гандлёвы параход і мінны загарадзіцель. Другому гандлёваму судну прычынены цяжкія пашкоджанні.

Англійскія самалёты ў ноч на 18 лістапада скінулі бомбы ў некаторых пунктах Заходняй Германіі.

У паветраных баях над Ла-Маншам учора было збіта тры англійскіх самалёты. Германская авіяцыя страціла 7 самалётаў».

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 18 лістапада. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што, не гледзячы на неспрыяючыя атмасферныя ўмовы, англійская авіяцыя ў ноч на 17 лістапада зноў зрабіла налёты на ваенныя аб'екты Гамбурга. На горад было скінута на працягу некалькіх гадзін многа тон бомб. Асабліва ўзмоцненай бамбардыроўцы падвергліся Цэнтральная таварная станцыя, буйныя нафтаачышчальныя заводы, электрастанцыя ў Альтоне (прадмесце горада), суднабудаўнічыя верфі і завод фірмы «Блом і Фос».

Авіяцыя берагавой абароны зрабіла рад налётаў на аэрадромы на акупіраванай непрыяцелем тэрыторыі. У рэзультаце ўзрываў бомб узніклі многалікія пажары. Адным з аб'ектаў бамбардыроўкі быў Дзюнкерк і докі Антверпена.

У час учарашніх паветраных баёў над Англіяй германская авіяцыя страціла 11 самалётаў, англійская— 4 знішчальнікі. Аднак лётчыкі трох англійскіх самалётаў выратаваліся.

ЛОНДАН, 18 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што англійская авіяцыя падвергла ў ноч на 18 лістапада бамбардыроўцы рад аб'ектаў у Рурскай вобласці.

Сёння раніцой былі бамбардыраваны пазіцыі германскіх гармат ля мыса Гры Нэ. Разрывы бомб былі бачны з англійскага ўзбярэжжа.

Па маючыхся звестках за апошні тыдзень, які скончыўся 16 лістапада, у час паветраных баёў над Англіяй было збіта 64 германскіх і 13 італьянскіх самалётаў.

Адхіленне патрабавання аб павышэнні зарплаты суднабудаўнічым рабочым Англіі

ЛОНДАН, 18 лістапада. (ТАСС). Федэрацыя прадпрыемцаў англійскай суднабудаўнічай прамысловасці адхіліла 15 лістапада патрабаванне прафсаюза суднабудаўнічых рабочых аб павышэнні заработнай платы суднабудаўнічых рабочых на 10 шылінгаў. Аналагічнае патрабаванне рабочых было адхілена два тыдні назад прадпрыемцамі машынабудаўнічай прамысловасці.

Ад'езд Чыано ў Германію

БЕРЛІН, 18 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ўчора ўвечары італьянскі міністр замежных спраў Чыано выехаў у Германію.

Паведамленне штаба дэ Голя аб ваенных дзеяннях у французскай экватарыяльнай Афрыцы

ЛОНДАН, 18 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, штаб арміі генерала дэ Голя апублікаваў учора камюніке, у якім паведамляецца, што ўся тэрыторыя Габона (Французская экватарыяльная Афрыка) знаходзіцца цяпер у распараджэнні генерала дэ Голя. Праз два дні пасля капітуляцыі Лібрэвіля, — гаворыцца ў камюніке, — войскам генерала дэ Голя здаўся другі порт Габона — порт Жантіль.

ЮГАСЛАЎСКАЕ КАМЮНІКЕ

БЕЛГРАД, 18 лістапада. (ТАСС). Югаслаўскае талеграфнае агенцтва перадае наступнае камюніке: «17 лістапада каля 4 гадзін раніцы замежныя самалёты паявіліся над гарадамі Вітоль і Кічэва. Дзякуючы хутка прадпрынятым дзеянням югаслаўскай зенітнай артылерыі і знішчальных самалётаў, замежным самалётам удалося скінуць бомбы толькі ў ваколіцах Кічэва і паблізу двух суседніх вёсак. Самалёты зараз-жа адступілі і пакінулі югаслаўскую паветраную зону. Афяр няма. Прычынен толькі нязначны матэрыяльны ўрон».

Грэка-італьянская вайна

Баі ў раёне Корчы

АФІНЫ, 18 лістапада. (ТАСС). Газета «Этнос» паведамляе, што грэчаская армія правяла ў 4 месцах італьянскі фронт. Заняты стратэгічныя пункты на поўнач і на поўдзень Корчы. Корча і дарога Аргірокастрон—Корча знаходзяцца пад непасрэдным кантролем грэчаскіх войск. Горад Эрсеке абстрэльваецца беспярэрыўным ружэйным агнём. У раёне гор Пінд грэкамі заняты разбураны горад Коніца і мястэчка Месогефіра. У раёне Калпакіу італьянская армія, апасаючыся акружэння з поўначы, адступае. На паўночным фронце італьянскія войскі прымушаны адступіць да другой узмоцненай лініі ў раёне горада Эльбасан.

Па атрыманых звестках грэчаскія войскі з трох бакоў акружылі Корчу. Італьянцы адступаюць у паўночна-заходнім напрамку за даліне ракі Дзевол.

Напярэдадні 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча

Дзейна рыхтуюцца працоўныя Беластока і вобласці да наблiжаючагася 85-годдзя з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Створаны ў Беластоку юбілейны камітэт распрацаваў рад мерапрыемстваў па ўшанаванню памяці паэта.

На прадпрыемствах, ва ўстановах і школах будуць праведзены гутаркі для рабочых, служачых, працоўнай інтэлігенцыі і школьнікаў аб жыцці і дзейнасці Міцкевіча.

Пры Беластоцкай абласной бібліятэцы ў бліжэйшы час адкрываецца выстаўка твораў паэта на польскай мове і ў перакладах.

Над перакладам твораў Адама Міцкевіча працуюць зараз беластоцкія пісьменнікі. Паэт Максім Танк пераклаў на беларускую мову «Крымскія санеты». Яўрэйскі паэт Кнапгайс перакладае на яўрэйскую мову ўрыўкі з драмы «Дзяды».

Спецыяльны даклад, прысвечаны юбілею, будзе прачытан у Доме Чырвонай Арміі.

26 лістапада ў дзень юбілея ў Беластоцкім гарадскім тэатры адбудзецца вялікі літаратурны вечар. Намечана таксама праводзенне экскурсіі ў музей Міцкевіча ў Навагрудку.

Адам МІЦКЕВІЧ

Бура

Мачты палі, руль трэснуў, рык хваль, шум завеі,
Крык трывожны людзей, енк злавесны насосаў —
Апошнія канаты рвуцца з рук матросаў —
У крыві сонца заходзіць, з ім рэшта надзеі.
Вецер завыў з трыумфам, па го рах салёных,
Што з хаосу марскога павержаны ўсталі,
Геній смерці ішоў да карабля праз хвалі,
Як салдат штурмуючы вялом бастыёну.
Адны, як нежывыя, паляглі ў трумах,
Ці з прыяцелямі развітваюцца, млеюць,
Другія смерці злань малітвай адганяюць.
Толькі адзін падарожны сядзеў і думаў:
Шчаслівы той, хто сілы згубіў ці ўмее
Маліцца, або з кім развітацца мае.

З польскай мовы пераклаў
МАКСІМ ТАНК.

Рыхтуюцца да юбілею Адама Міцкевіча

У Граеўскім раёне створан камітэт па праводзенню юбілейных урачыстасцей, прысвечаных 85 гадавіне з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

Камітэт распрацаваў план работы. Намечана правесці ў мястэчках і сельсаветах 15 дакладаў аб жыцці і творчасці паэта. У дзень юбілею адбудзецца урачысты пленум райвыканкома. Для ўвекавечання памяці паэта на зацвярджэнне райвыканкома ўнесена прапанова аб прысваенні імені Адама Міцкевіча адной з вуліц Граева.

Рэспубліканская нарада бібліятэчных работнікаў

Днямі ў Беластоку адбылася нарада бібліятэчных работнікаў заходніх абласцей БССР. У ёй прыняла ўдзел 175 чалавек загадчыкаў абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх бібліятэк і кіраўнікоў бібліятэчных калектараў. На нараду прыбыла 15 работнікаў лепшых бібліятэк усходніх абласцей Беларусі.

З дакладамі выступілі абласныя бібліятэчныя інспектары.

У Беластоцкай вобласці зараз працуюць адна абласная бібліятэка, 23 раённых, 9 гарадскіх, 74 сельскіх і 3 дзіцячых бібліятэкі. З сельскіх бібліятэк заслугоўвае пахвалы бібліятэка ў вёсцы Малы Полацк, Кольнаўскага раёна. Бібліятэкай праведзена вялікая масавая работа, арганізавана рад вечароў мастацкай самадзейнасці, створан гурток ГСА (Гатоў да санітарнай абароны). Дзейна ўключыліся работнікі бібліятэкі ў выбарчую кампанію па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У спрэчках выступіла дырэктар віцебскага Дома кнігі тав. Баранава. Яна расказала прысутным, як трэба арганізаваць работу ў бібліятэцы ў сувязі з прадстаячымі выбарамі ў мясцовыя Советы.

У сваім заключным слове начальнік бібліятэчнага ўпраўлення Народнага Камісарыята асветы БССР тав. Злоцін падкрэсліў, што бібліятэчныя работнікі павінны ўмець падабраць чытачу адпаведную літаратуру на неабходны яму мове. Таму трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на павышэнне свайго ўласнага культурнага ўзроўню.

Трэці і апошні дзень нарады быў прысвечаны рабоце асобных секцый.

Нарада прыняла прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну.

АД ТРЭЦЯГА АДДЗЯЛЕННЯ МІЛІЦЫІ

3-ім аддзяленнем міліцыі горада Беластока затрыман зладзей, у якога пры вобыску знойдзена многа розных кашалькоў, партфеляў і жаночых сумак.

Просім пацярпеўшых звярнуцца ў 3-е аддзяленне міліцыі для апазнання сваіх рачаў.

3-е гарадское аддзяленне міліцыі.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—99. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку.